УДК 94:070:37.014(476)"1917–1918"

# ГАЗЕТА «ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ» АБ УЛАДКАВАННІ АДУКАЦЫІ Ў КРАІНЕ

***У.У. Кручко*** (ГДУ імя Ф. Скарыны)
Навук. кір. ***В.А. Міхедзька***,
канд. гіст. навук, дацэнт

У 1917–1918 гг. на старонках блізкай да Беларускай сацыялістычнай грамады газеты «Вольная Беларусь» асвятляліся розныя палітычныя і сацыяльныя праблемы тагачаснай Беларусі і, у тым ліку, пытанні ўладкавання нацыянальнай школьнай адукацыі. Важную ролю аўтары газеты адводзілі беларускай пачатковай школе, якая павінна была быць і працоўнай, і навуковай. Настаўнік павінен не толькі растлумачыць матэрыял вучням, але і паказаць гэта па магчымасці, а нават і даць ім зрабіць тое. Вучні павінны былі праходзіць навучальную практыку: «… З гліны трэба ляпіць, а з дрэва выразаць розныя рэчы, пачынаючы з простых: кубы, кулі, хаты і г. д. Усё гэта будзе зроблена груба, але гэта не бяда: дзеці будуць мець магчымасць развіваць свае здольнасці. А тым часам сярод іх знойдуцца і таланты» [1, с. 3]. У снежні 1917 г. газета апублікавала артыкул, у якім было адзначана, што ў школах Беларусі ўвогуле не выкладалася беларуская мова. Былі расійскія і польскія школы, але беларускай школы не было. Для развіцця беларускай мовы ў школах прапаноўвалася стварэнне буквара на беларускай мове і яго ўвядзення ў пачатковыя школы [2, с. 2]. Для развіцця адукацыі, як паведамляла «Вольная Беларусь», ў Мінску былі адчыненыя курсы беларускай мовы, нісьменства, гісторыі і геаграфіі. У газеце пісалі:«…Курсы для агульнай люднасці будуць цікавыя тым, што гэта ў першы раз пазнаёміць слухачоў з беларускім народам і дасць патрэбнае разуменне мэтаў і задачаў існуючых беларускіх арганізацый, якія бяруць свой пачатак з часоў Рэчы Паспалітай. А для беларусаў – курсы будуць і першаю школаю для азнаямлення з сваім краем» [3, с. 4].

**Літаратура**

1. Якая нам патрэбная пачатковая школа? [Электронны рэсурс] // Вольная Беларусь. – 1917. – № 25. – Рэжым доступу: https://knihi.com/none/ Volnaja_Bielarus_pdf.zip.html#15n_184_1917_n_25.pdf_3.
2. Навучэнне роднай мовы ў пачатковых школах [Электронны рэсурс] // Вольная Беларусь. – 1917. – № 34. – Рэжым доступу: https://knihi.com/none/ Volnaja_Bielarus_pdf.zip.html#15n_184_1917_n_34.pdf_2.
3. Беларускія курсы [Электронны рэсурс] // Вольная Беларусь. – 1917. – № 34. – Рэжым доступу: https://knihi.com/none/ Volnaja_Bielarus_pdf. zip.html#15n_184_1917_n_34.pdf_4

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова